# *СУСТРЭЧА 8*
# *ЛЮБОЎ АДКРЫТАЯ НА ІНШЫХ*

---

«Клопат аб узрастанні любові да бліжняга паміж бацькамі і дзецьмі з'яўляецца вялікім трыумфам узаемнай любові сужэнцаў. Я думаю аднак таксама аб тых, хто не мае дзяцей, яны зноў будуць цярпець, бо гэтае цярпенне заўсёды з імі. Абяцаем ім малітву, каб Бог благаславіў іх ласкай плоднасці, так, як яны гэтага прагнуць. А для тых, хто не мае надзеі на магчымасць мець дзяцей, мы просім Бога аб дары вялікай духоўнай плоднасці».

а. Анры Кафарэль

---

**1. Уводзіны**

Нас будуць судзіць з любові, а таму адкрытасць нашай любові – гэта асаблівае патрабаванне. У першую чаргу наша адкрытасць – гэта адкрытасць на новае жыццё – «пладзіцеся і размнажайцеся». У адваротным выпадку наша любоў можа аказацца няпраўдзівай альбо ўвогуле можа быць выражэннем нашай уласнай эгаістычнай любові.

**2. Сустрэча суполкі**

## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*




***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

Гэтая частка сустрэчы дазваляе нам пакінуць прастору нашай штодзённасці, сустрэць тых, хто для нас важны і для каго важныя мы. Калі вы сутыкнуліся з нейкай праблемай, вельмі складанай для вас, памятайце, што вы можаце папрасіць суполку аб парадзе, альбо таксама проста аб тым, каб вас выслухалі, гэта таксама дапамагае.

На гэтай сустрэчы мы дзелімся Божым Словам, у якім Хрыстос звяртаецца да нас «вы – соль зямлі». Не раз сярод сужэнстваў паўстае сумненне: ці Рух, які з'яўляецца рухам сужэнскай духоўнасці, не занядбоўвае дзяцей? Тым часам Хрыстос гаворыць да нас проста, што гэта вы з'яўляецеся соллю зямлі, найважнейшым асяродкам для вашых дзяцей. Гэта ваша любоў, вашыя высілкі будуць самым вялікім дарам для вашых дзяцей. Давайце нагадваць сабе аб гэтым заўсёды, калі губляем з полю зроку сваё ўласнае развіццё.

## *ІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*




***Малітва супольнасці***

**Мц 5, 13-16**

---

«Вы - соль зямлі. Калі ж соль страціць смак, то чым пасоліш яе? Яна ўжо ні на што не прыдасца, хіба што выкінуць яе вон на патаптанне людзям. Вы - святло свету. Не можа схавацца горад, які стаіць на вяршыні гары. І, запаліўшы светач, не ставяць яго пад пасудзінай, але на свечніку, і свеціць усім, хто ў доме. Няхай святло ваша так свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашы добрыя ўчынкі і праслаўлялі Айца вашага, які ў нябёсах».

---

Калі вы будзеце ў спантаннай малітве дзякаваць, прасіць і перапрашаць Бога, то заўсёды памятайце і верце ў сілу малітвы супольнасці

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

*Дзяленне рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку*

Коратка падзяліцеся тым, якое месца займала ў вашым жыцці асабістая малітва ў гэтым месяцы. Перад сустрэчай падумайце, ці сапраўды вы мелі час на асабістую сустрэчу з Богам. Падзяліцеся тым, якія малітвы любіце. Што цяпер значыць для вас «рэгулярнасць» у слуханні Божага Слова. Ці замянілі вы выказванне «можа калі-небудзь паразмаўляем» на запланаваны час на дыялог у прысутнасці Бога.

## *Тэкст да абмену думкамі*

На гэтай сустрэчы мы будзем дзяліцца нашымі думкамі на тэму прыняцця дзяцей, якімі Бог нас адорвае, і іх выхавання. Гэта заўсёды важная тэма.

Сужэнская любоў не закрывае мужа і жонку ў іх уласным коле. Калі б так было, яна азначала б толькі замаскіраваны эгаізм. Яна адкрывае сужэнцаў на іншых людзей. У першую чаргу на дзяцей, якіх мы павінны прыняць і выхаваць па-каталіцку. Пасля шырэй – на ўсіх людзей вакол. І нарэшце, так як гэта хрысціянская любоў, дазваляе сужонкам убачыць Добрую Навіну любові Божай, якая аб'яўляецца ў Хрысце.

У гэтым тэксце з'явіцца шмат пытанняў. Успрымайце іх як магчымасць паразважаць над сваім жыццём. Можаце далучыць гэтыя пытанні да «Сядзем разам». Можаце вяртацца да гэтых пытанняў у наступныя месяцы.

*Даваць жыццё*

Любоў дынамічная. Гэта вялікая стваральная сіла! Адзін погляд любові абуджае ў нас нечаканыя крыніцы сіл: у пэўным сэнсе стварае нас. Дае нам новыя вочы, якімі мы бачым прыгажосць свету. Яна стваральная. Яна ўдзельнічае ў стваральнай моцы Бога Любові.

Ці ж не дае любоў мужчыны і жанчыны жыццё трэцяму стварэнню «на вобраз і падабенства» Божае? І калі гэта хрысціяне, то мужчына і жанчына ведаюць, што яны з'яўляюцца пасрэднікамі Бога ў яшчэ большай справе: прыводзяць да Яго сваё дзіця, каб Ён зрабіў яго Сваім дзіцём, каб праз хрост уліў у яго Сваё Божае жыццё.

У сувязі з гэтым, давайце зададзім сабе некалькі вельмі канкрэтных пытанняў:

- Чым для нашага саюзу з'яўляецца дзіця? Ці ўпісвалася яно ў нашыя планы, калі мы сустрэліся?
- Якім чынам мы прынялі дзяцей, калі яны з'явіліся ў нашым саюзе? Ці гатовыя мы прыняць наступных дзяцей?
- Што для нас значыць «адказнае бацькоўства»?
- Ці свядомае планаванне сям'і з'яўляецца для нашага саюзу якой-небудзь праблемай?
- Ці ведаем мы важныя тэксты Касцёла, якія датычаць гэтай тэмы? Ці нармальна гэта, што Касцёл уваходзіць у гэтыя тэмы? Чаму так робіць?
- Ці ведаем мы розныя метады назірання рытму плоднасці жанчыны? Ці бачым мы вартасць гэтай здольнасці ў развіцці нашай любові?
- Ці здольныя мы выстаяць перад выпрабаваннем неплоднасці? Якім чынам мы гэта перажываем? Якая наша пазіцыя адносна новых рашэнняў, якія біялогія прапануе ў

вобласці нараджэння (in vitro) і адносна стаўлення Апостальскай Сталіцы да гэтай тэмы?

*Выхаванне*

Любоў – крыніца жыцця – вучыць свабодзе. Наша бацькоўская роля не заканчваецца з момантам нараджэння дзіцяці: гэтае маленькае стварэнне, якое нараджаецца з нас і аднаўляецца ў Богу, патрабуе дапамогі, каб дасягнуць дарослацсі чалавечай і хрысціянскай, гэта значыць у дасягненні той сапраўднай свабоды, якая робіць здольным любіць па-сапраўднаму. На гэтым неабсяжным полі выхавання засяродзімся адзінае на найважнейшай характарыстыцы: выхаванне з'яўляецца справай любові; дазваляе дзіцяці ўзрастаць у свабодзе; наследуе Бога, выхавацеля Свайго народа.

*Выхаванне ў любові*

Гэта любоў выхоўвае: любоў бацькоў да сваіх дзяцей, а магчыма яшчэ больш любоў паміж самімі бацькамі. Што мы адкрылі для сябе саміх праз любоў нашага бацькі і маці? Пры якіх умовах любоў, якую мы даем нашым дзецям, дапамагае ім узрастаць? Як захаваць правільную раўнавагу паміж клопатам і патрабаваннем?

*Выхаванне да любові*

Любоў да дзяцей заключаецца ў тым, каб дапамагчы ім атрымаць незалежнасць, мужчынскасць і жаноцкасць, а таксама хрысціянства ў меры дарослай асобы. Навука свабоды, якой вы іх вучыце, пазначаная чарговымі «раставаннямі» (нараджэнне, першыя крокі, паход у школу, перыяд сталення, шлюб).

«У болю будзеш нараджаць дзяцей»: так выглядае праўда аб павольным нараджэнні да свабоды. Якім чынам мы дапамагаем сваім дзецям у паступовым дасяганні незалежнасці? Як вы перажывалі папярэднія «раставанні»? Як лепш падрыхтавацца да тых, што ўжо бачныя на гарызонце? Як на практыцы ў нас атрымліваецца спалучыць абавязковы для дзяцей аўтарытэт і павагу да іх свабоды?

*На вобраз Бога і Хрыста*

Бог – наш Айцец. Уся Біблія паказвае нам, як Бог па-айцоўску выхоўвае свой народ. Мы можам лепш зразумець гэта праз наша сямейнае жыццё: тое, што мы перажываем у адносінах да нашых дзяцей, уводзіць нас у разуменне любові Бога да нас, і наадварот. Жывы і канкрэтны вобраз Божай любові мы знаходзім у Хрысце. Для нас было б вельмі карысна знайсці ў Евангеллі праявы выхаваўчай пазіцыі Хрыста і засвоіць яе сабе: патрабаванне і міласэрнасць; цярплівасць; праўдзівасць і давер; прыняцце паразы і надаванне ёй пазітыўнага сэнсу, павага да асабістага выбару.

*Сведчанне*

Сужэнская любоў, як кожная любоў, не можа закрыцца на сабе, калі павінна прынесці плён. Чым яна больш глыбокая, тым шырэй патрабуе сведчыць. А так як гэта любоў хрысціянская, то яна нястомна прамянее ў вачах тых, хто ёй жыве, прамянее бляскам Добрай Навіны, абвешчанай праз Езуса Хрыста: Айцец любіць нас і запрашае нас на пір сваёй любові. Сведчанне сужэнцаў становіцца вельмі асаблівым сведчаннем любові: любові прынятай як дар, любові, якую перажываем як цудоўную прыгоду. Гэтай любоўю мы дзелімся са светам, як Божым пакліканнем і як вялікім багаццем. У чым канкрэтна для нас заключаецца сведчанне хрысціянскага сужэнства? Як несці яго адначасова жыццём і словам? Праз прыняцце якіх заданняў у Касцёле і грамадстве мы

спрабуем даваць гэтае сведчанне? Ці мы часам прыглядаемся разам да спосабаў рэалізацыі гэтых заданняў? Якое месца займае ў нашай сям'і гасціннасць?

*ТЭКСТ*

**Жан Ванье, заснавальнік «Каўчэгу», умела тлумачыць нам, якія вартасці датычныя плоднай любові, бо штодзённа мае з гэтым кантакт:**

Плоднасць любові – гэта тое, што існуе не толькі ў сям'і. Яна ў кожных міжасабовых зносінах, перад усім у адносінах аказання дапамогі. Добры настаўнік – гэта не толькі той, хто ведае свой прадмет і здолее навучыць; гэта таксама той, хто здолее любіць, шанаваць сваіх вучняў, убачыць у іх асобаў. Яго падыход, поўны павагі, адкрытасці і любові, абуджае іх давер і адкрывае на яго навуку. Тое ж самае адносіцца да святара, доктара, сацыяльнага працаўніка, выхавацеля, псіхолага, чалавека, які дапамагае бедным і г.д. Гэта прысутнічае ў кожнай чалавечай сустрэчы. Таксама адбываецца і ў супрацы з іншымі.

Мы інакш устанаўліваем стасункі, калі дамінуем, спрабуем данесці сваю перавагу, кантралюем, а часам знішчаем іншых, выклікаем страх; альбо застаёмся пасіўнымі, дазваляем іншым рабіць тое, што яны хочуць, не бяром адказнасць, займаем пазіцыю ахвяры.

Мы можам таксама устанавіць стасункі, у якіх умацоўваем другую асобу, шануем, адчуваем да яе давер і дапамагаем ёй адкрыць свае таленты і развіць тое, што ёсць у ёй найлепшае. Зрэшты часта здараецца пераход ад адной пазіцыі да другой. Супольнасць, сям'я, група, у якой мы працуем, мацнее, калі стасункі плённыя, поўныя любові, поўныя ўзаемнага даверу.

Бацькі бяруць адказнасць за сваіх дзяцей і абавязаныя да гэтай адказнасці. Дзіця свабоднае і з кожным годам усё больш выказвае сваю свабоду. Бацькі нясуць адказнасць за падрыхтоўку да гэтай свабоды, а не за яе знішчэнне. Дзіця пакліканае, каб узрастаць у свабодзе: свабоднае ад страху, свабоднае да любові, свабоднае ў пазнаванні праўды і жыцця ў праўдзе. Прафесія бацькоў – гэта прыгожы, хоць і патрабавальны занятак.

Плоднасць адрозніваецца ад вытворчасці і творчасці. Існуе «плоднасць» мастацкая, часам цудоўная. Твор мастацтва, кніга, мелодыя, скульптура, вынаходніцтва, карціна павінны пачацца, саспець і нарадзіцца, нярэдка ў цяжкасцях. Але гэты твор застаецца інэртным. Прыходзіць момант, калі твор скончаны; ён прыгожы і не патрабуе нічога больш. А жывога чалавека трэба накарміць, любіць, выхаваць; ніхто не сядае, каб ім захапляцца; нельга пакінуць яго ў куце, калі ён перашкаджае; мы пэўным чынам залежныя ад яго.

Чалавечая плоднасць накіраваная на асобу, суб'ект, які таксама пакліканы да супольнасці. Плоднасць выцякае з супольнасці і імкнецца да супольнасці. Таму таксама плоднасць, як перадача жыцця, абуджае ў некаторых страх. Менш патрабавальным з'яўляецца стварэнне прадмету, які мы можам адставіць убок, калі ўжо не хочам яго, чым на ўсё жыццё застацца адказнымі за дзіця бацькам і маці. Калі мы становімся адказнымі, мы становімся больш чалавечнымі; узрастаем у дарослацсі; адкрываемся на іншых».

*Жан Ванье, «Кожны чалавек – гэта святая гісторыя».*

- ***Абмен думкамі на сустрэчы***

- Ці адчуваеце вы сябе любімымі Богам? Калі не адчуваеце сябе любімымі і гэта не вельмі асабістае, падзяліцеся чаму.
- Што добрага вы ўзялі са свайго дому? За якія атрыманыя дары ў вашых сем'ях вы хацелі б падзякаваць Пану Богу?
- Што вы хацелі б перадаць сваім дзецям, а чаго б вы асабліва хацелі пазбегнуць у выхаванні вашых дзяцей?

***Харызмат Руху і педагогіка***

Ксёндз Кафарэль прапанаваў сужэнцам, якія хочуць духоўна ўзрастаць, увесці ў сваё жыццё канкрэтныя вымаганні, якія будуць для іх дапамогай ў развіцці. На першым месцы паставіў вызначэнне асабістага правіла жыцця.

---

«Без «Правіла жыцця», вельмі часта вольнасць кіруе рэлігійным жыццём сужэнцаў і робіць яго неўпарадкаваным. «Правіла жыцця» (кожны сужэнец выбірае сабе ўласнае) з'яўляецца нічым іншым, як вызначэннем высілкаў, якія кожны з сужэнцаў будзе прыкладаць, каб лепш адказаць на Божы заклік. Тут ідзе гаворка не аб памнажэнні абавязкаў, а толькі аб іх удакладненні, каб узмацніць волю і пазбегнуць адхіленняў». Карта END

---

Суполкі Маці Божай запрашаюць вас кожны месяц вызначаць сабе «правіла жыцця». Гаворка ідзе аб тым, каб пасля разважання над адносінамі з Богам і з іншымі людзьмі, вызначыць пункт альбо пункты, над якімі вы будзеце працаваць на працягу месяца так, каб у абедзвюх гэтых сферах дасягнуць пэўнага развіцця. Правіла жыцця можа датычыцца розных аспектаў. Яно можа быць вельмі асабістым і тады звычайна не адкрываецца іншым членам суполкі; у іншым выпадку мы можам прыйсці па параду і дапамогу да суполкі.

Якім чынам вызначыць сабе правіла жыцця?

**Падумаць.** Каб акрэсліць правілы жыцця, патрэбен высілак, ясны погляд на самога сябе, а таксама вынаходлівасць, каб знайсці дзейсныя сродкі, якія давядуць да чаканай мэты.

**Параіцца з Богам.** Трэба шукаць Яго чаканні адносна нас, прасіць Яго святла ў поглядзе на саміх сябе, на выбары канкрэтных рашэнняў, якія трэба прыняць. Шмат пар акрэслівае альбо змяняе сваё правіла жыцця ў часе рэкалекцый. Гэта вельмі спрыяльны момант. Добрым момантам можа быць таксама падрыхтоўка да сакрамэнту пакуты, малітва, абавязак «Сядзем разам».

**Папрасіць парады.** Досвед паказвае, што самі мы ведаем сябе вельмі слаба, што мы патрабуем погляду на нас саміх вачамі іншых людзей, што часта мы не можам аб'ектыўна разважаць над уласнай справай. Быць хрысціянінам значыць быць настолькі пакорным, каб карыстацца парадамі і дапамогай. Таму трэба папрасіць аб дапамозе і падтрымцы тых, хто добра нас ведае і каго Бог паставіў каля нас:

- сужонка (не дасягайце аднак уласных мэтаў, не спрабуйце змяніць сужонка, каб вам было лепш, а з любоўю глядзіце на свайго сужонка);

- суполку: калі мы дзелімся жыццём, гэта таксама датычыць правіла жыцця. Калі ўважліва ўслухоўвацца ў тое, чым дзеляцца іншыя, то гэта можа стаць нагодай, каб атрымаць дапамогу; а калі хопіць адвагі, то можна наўпрост папрасіць аб парадзе;
- спаведніка альбо духоўнага дарадчыка; часцей за ўсё ён дапаможа нам адкрыць тое, што найважнейшае для нашага духоўнага жыцця, часам ён ацэніць выбраныя сродкі.

Ніхто не можа замяніць нас у вызначэнні для нас правіла жыцця, аднак іншыя могуць падказаць нам, якія схільнасці трэба ў сабе пераканаць, якія таленты развіць, альбо ў якіх, па іх меркаванню, мы можам дасягнуць поспеху. І нарэшце спрабаваць: часам мы занадта доўга нешта даследуем, пакуль знойдзем адпаведныя сілы (не за шмат, на за мала) і найлепшыя сродкі для рэалізацыі.

Можна трымацца схемы як паступіць, змешчанай ніжэй, яна забяспечвае плённасць правіла жыцця:

- агляд,
- распрацоўка плану рэалізацыі правіла жыцця,
- рэалізацыя,
- ацэнка дасягнутых вынікаў.

Аб распазнанні гаворка была вышэй. Калі ваша духоўнае развіццё будзе ісці наперад, звярніце ўвагу, што, выбіраючы правіла жыцця, вы будзеце пытацца сябе аб святасці, аб дарогах, па якіх вы павінны ісці да Бога.

Распрацоўка плану абазначае, што з правіла вы павінны зрабіць для сябе заданне, якое будзе ясна акрэслена. Калі вы вырашыце, што тым, што зараз найбольш аддаляе вас ад Бога з’яўляецца прагляд тэлебачання, то зрабіце сабе, напрыклад, адзін дзень без тэлевізара для пачатку. Але перш чым зрабіць гэта, адкажыце сабе на пытанне, у чым заключаецца зло доўгага прагляду тэлевізара ў вашым жыцці. Зло – гэта заўсёды адсутнасць якога-небудзь дабра. У гэтым выпадку зло заключаецца хутчэй за ўсё ў тым, што гэты час не быў падораны сужэнцу і дзецям. Старайцеся настойліва рэалізоўваць пастаўленыя мэты. У справах, якія патрабуюць канцэнтрацыі, вы можаце папрасіць дапамогі ў сужонка.

На пачатку шляху, калі натрапіце на цяжкасці рэалізацыі пунктаў высілку, можаце ўзмацняць свае высілкі, далучаючы іх да правіла жыцця – у пэўным сэнсе два ў адным. Але заўсёды старайцеся, каб ваша правіла жыцця мела вельмі канкрэтную форму.

Калі, напрыклад, у вас не атрымліваецца маліцца гімнам *Магніфікат*, таму што адзін з сужонкаў гатовы маліцца, а ў другога ўжо закрываюцца вочы, вы можаце ўстанавіць наступнае правіла жыцця – запланаваць іншы час для гэтай малітвы (маліцца раней). Каб не забыцца аб гэтым, вы можаце паставіць сабе сігнал на тэлефоне на канкрэтны час.

Найлепшай формай развіцця правіла жыцця з’яўляецца штодзённы рахунак сумлення, у якім мы пытаемся найперш у сябе, ці памяталі мы аб правіле жыцця, а пасля разважаем, які плён прынесла нам выкананне гэтага правіла. І заўсёды памятайце аб адным. Нашыя магчымасці абмежаваныя. Таму далучыце сваё правіла жыцця да сваёй асабістай малітвы. Няхай Божая дапамога стане вашай сілай. Досвед многіх сужэнстваў паказвае, што істотнай перашкодай у рэалізацыі правіла жыцця з’яўляецца тое, што аб ім забываюцца. Таму важна занатаваць сабе прынятае правіла жыцця.

## *Фінансавы ўклад у матэрыяльнае жыццё Руху*

«Сужэнствы, якія належаць да Руху, абавязаныя рабіць штогадовую ахвяру ў форме дару – плёну аднаго дня іх працы. Ахвяраванне гэтага дня працы павінна забяспечыць матэрыяльны быт і развіццё Руху, якому пары, у пэўнай ступені, абавязаныя сваім духоўным узбагачэннем».

Карта END

Рух Equipes Notre-Dame, як гаворыць сама назва, з'яўляецца рухам. Рух – гэта супольнасць асобаў, удзельнікамі якой становяцца людзі, якія ў выніку ўласнага прынятага рашэння, абсалютна свабодна пастанаўляюць выконваць мэты, акрэсленыя Рухам. Нагадаем, што мэтай, якая знаходзіцца ў цэнтры Руху Equipes Notre-Dame, ёсць святасць сужэнства. Гэта адзіная мэта Руху.

Хоць Рух END не з'яўляецца арганізацыяй у поўным значэнні гэтага слова, ён аднак карыстаецца некаторымі інструментамі, уласцівымі паняццю арганізацыі. Між іншым, Рух END валодае пэўнымі невялікімі сродкамі на патрэбы дзейнасці. Гэтыя сродкі паходзяць ад сужэнстваў, якія прынялі Карту і ўдзельнічаюць у жыцці Руху. Сужэнствы добраахвотна здаюць грошы, адпаведныя аднаму дню іх працы.

Вось некалькі важных заўвагаў, якія датычаць штогадовага дару аднаго дня працы:

- Нікога не прымушаюць перадаваць сродкі, якія адпавядаюць даходу аднаго дня працы сужэнства. Падобна, як іншыя пункты высілку, выконваць якія Рух не прымушае, а толькі прапануе. Падобным чынам з дарам аднаго дня працы. Аднак тыя сужэнствы, якія ўступаюць у Рух і ўдзельнічаюць у жыцці Руху, павінны прымаць усе правілы Руху. Выбарачнае выкананне правілаў Руху азначае, што сужэнства стварае свой уласны рух і тым самым адмаўляецца ад прыналежнасці да Руху END. Ёсць, аднак, пэўная розніца паміж іншымі пунктамі высілку і дарам дня працы. У выпадку іншых пунктаў высілку сужэнства прызнае толькі, што будзе шчыра прыкладаць намаганні, каб выконваць прапанаваныя пункты. Сужэнства не можа акрэсліць, калі яго высілкі дадуць канкрэтны эфект. Акцэнт ставіцца на высілак. Аднак у выпадку дара працы мы не прызнаем высілку, мы прызнаем дзеянне, якое заключаецца ў перадачы даходаў ад аднаго дня працы на карысць Руху.
- Сродкі, якія мы перадаём, маюць характар «дару». Гэта не аплата сяброўства, не даніна, не страхоўка, гэта проста дар. Сутнасцю дара з'яўляецца сэрца, адкрытае на дабро, якога можна дасягнуць праз ахвяраваны дар. Сужэнствы могуць знаходзіцца ў розных матэрыяльных становішчах. І бывае так, што не даюць са сваіх лішкаў. Магчыма, аддаюць штосьці, чаго ім не хапае. У такім выпадку дар набывае асаблівую вартасць. Тады ён заключае ў сабе асаблівую рысу, якую мы сустракаем на старонках Евангелля.

*«Езус, (...) сеўшы насупраць скарбонкі, назіраў, як людзі кідалі грошы ў скарбонку. Многія багатыя кідалі памногу. Прыйшла адна бедная ўдава і ўкінула дзве лепты, што складае адзін кадрант. Паклікаўшы вучняў сваіх, Езус сказаў ім: «Сапраўды кажу вам, што гэтая бедная ўдава ўкінула больш за ўсіх, хто кідаў у скарбонку. Бо ўсе кідалі, маючы лішак, а яна, будучы ў нястачы сваёй, укінула ўсё, што мела, увесь пражытак свой»* *(Мк 12, 38-44)*.

## Дадатак

Практычныя заўвагі, якія датычаць дару аднаго дня працы.

- Як практычна можна перадаць дар аднаго дня працы? Мы перадаём яго да канца сакавіка, кожны каляндарны год. Таму самае позняе на сакавіцкай сустрэчы збіраем грошы ў кожнага сужэнства. Зручным спосабам з'яўляецца падрыхтаваць канверт, у які кожнае сужэнства асобна кладзе свой дар. Ніхто не правярае, колькі грошай паклалі сужэнцы. Аднак пасля сустрэчы адказная пара суполкі падлічвае, якая сума была сабраная і ўкладывае ў асобны канверт картку з інфармацыяй пра суполку і суму. Адказная пара перадае гэты канверт сувязной пары суполкі. Пасля грошы трапляюць да пары сектара, якая пасля таго, як сабраныя ўсе грошы, перадае поўную суму адказным за Рэгіён.
- Як акрэсліць велічыню аднаго дня працы? Гэта зрабіць дастаткова проста. Напрыклад:

  ***а)*** Бяром свой сумарны гадавы заробак, адлічваем падатак і дзелім яго на 252 (сярэдняя лічба дзён працы за год).

  ***б)*** Таксама можна ўзяць сярэдні штомесячны заробак і падзяліць на сярэднюю колькасць працоўных дзён (прыкладна 21).

Калі нехта атрымлівае заробак не толькі на асноўнай працы, а недзе яшчэ, то яго таксама трэба ўлічваць пры падліку працы аднаго дня.

Гэта практыка – таксама добрая нагода, каб зрабіць сваю ўласную бухгалтэрыю, дзе сям'я зможа планаваць і размяркоўваць грошы на бягучыя і будучыя выдаткі.

- На што трацяцца грошы, якія перадаюць сужэнствы? Агульную інфармацыю на тэму кіравання дабротамі падае артыкул 8 Кананічных Статутаў Equipes Notre-Dame. Сабраныя сродкі па частках перадаюцца адказным на сусветным узроўні. Грошы, якія застаюцца, выкарыстоўваюцца, каб фінансаваць Рух на гэтай тэрыторыі – у Беларусі, на узроўні Рэгіёну, Сектару. Яны, паміж іншым, пакрываюць кошты падарожжаў адказных, якія ў рамках свайго служэння прымаюць удзел у сустрэчах у Рэгіёне, Сектары.

  Прыкладам такіх праектаў можа быць фінансаванне:

  - правядзення калегіума Рэгіёну, на якім праводзіцца фармацыя Сувязных пар і Адказных пар Сектараў;
  - сустрэча экіпы Сектара, на якой абмяркоўваецца сітуацыя ў Сектары і выпрацоўваецца план мерапрыемстваў на наступны фармацыйны год;
  - сустрэча Адказных пар суполак, на якой праводзіцца фармацыя Адказных пар;
  - дня Сектара, на якім усе сужэнствы Сектара сустракаюцца для інтэграцыі;
  - забеспячэнне пілігрымак і аплатковага спаткання;
  - прэзентацыя Руха у іншых гарадах Беларусі;
  - пілатажы, звязаныя з даездам пілатуючай пары ў іншыя гарады.

**3. Заданні на час паміж сустрэчамі** 

- **Памятайце аб аб штодзённай малітве *МАГНІФІКАТ*.**
- Памятайце аб рэалізацыі ўведзеных на сустрэчы канкрэтных пунктаў высілку. Увядзіце правіла жыцця, лепш простае, якое пакажа, што вы здольныя на яго рэалізацыю. Прасіце Бога аб дапамозе ў яго рэалізацыі.